УДК 811.161.3’367:821.161.3-36

# БЕЛАРУСКІЯ ЛІТАРАТУРНЫЯ АФАРЫЗМЫ СА СТРУКТУРАЙ ПРОСТАГА СКАЗА СА ЗВАРОТКАМ

Шпакоўская Вікторыя Аляксандраўна
старшы выкладчык кафедры замежных моў установы адукацыі
“Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова”
(г. Магілёў, Беларусь)

*У тэксце разглядаюцца беларускія літаратурныя афарызмы са структурай простага сказа са звароткамі, апісваюцца разнавіднасці звароткаў, паказваецца іх уплыў на стылістычную афарбоўку афарызмаў.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сярод беларускіх літаратурных афарызмаў са структурай простага сказа даволі часта сустракаюцца выслоўі, у якіх структура сказа ўскладнена разнастайнымі сінтаксічнымі канструкцыямі [1, с. 152–156, 162–166].

Ускладненне простага сказа "уяўляе сабой адпаведнае разгортванне асобных кампанентаў або ўсяго сказа, калі тыя патрабуюць свайго пашырэння ці ўдакладнення шляхам дабаўлення новых кампанентаў" [2, с. 144].

Беларускія літаратурныя афарызмы са структурай простага сказа ускладненай будовы ў беларускіх літаратурных афарызмах складаюць амаль палову ад агульнай колькасці афарызмаў са структурай простага сказа, якіх налічваецца каля 800 адзінак [3].

Сінтаксічныя канструкцыі, якімі ўскладняюцца афарызмы са структурай простых сказаў, маюць неаднолькавую прадуктыўнасць і розныя стылістычныя функцыі.

Беларускія літаратурныя афарызмы са структурай простага сказа са зваротκам складаюць 8,0% ад агульнай колькасці беларускіх літаратурных афарызмаў, пабудаваных па структуры простых сказаў ускладненай будовы (пераважна вершаванай формы).

Трэба адзначыць, што асноўная функцыя звароткa, якая заключаецца ў найменні адрасата гутаркі, у межах афарызма не выконваецца, таму зваротак у афарыстычных выслоўях мае яскрава рытарычны характар, напр.: *Ой, **саколю**, непрымецен, / Ды вялік жаночы труд! (Я. Колас).* Рытарычныя звароткі ўзмацняюць уздзеянне зместу афарызма на чытача і з'яўляюцца прадуктыўным элементам ускладнення простага сказа ў афарыстычных выслоўях.

Звычайна зваротак не звязаны сінтаксічна з іншымі членамі сказа, але ў афарызмах ён вельмі часта не можа быць элімінаваны без страты сэнсу ўсяго выслоўя, паколькі выкарыстоўваецца для азначэння суб'екта выказвання і выконвае ў такіх выпадках ролю ключавога кампанента ў афарызме, напр.: *І толькі на цябе надзея, / **Край родны мой**! (М. Багдановіч)*; *Як выказаць цябе, **маё маўчанне**? (А. Разанаў)*; *Ах, якая ты жорсткая ўсёткі, / **мудрасць людская** (Н. Гілевіч)*; *Будзь благаслаўлёнай век, **Прамень-душа**! (Н. Мацяш)*; *Пагавары са мной, **Зямля**, вачамі (Я. Янішчыц)*; *Вечназялёнага дрэва жыцця / Плод самы спелы і мудры садоўнік — / Ты, **чалавек**! (С. Законнікаў)*.

Зваротак, змешчаны на пачатку афарыстычнага выслоўя, выступае ў ролі "сваеасаблівага зачына і тым самым падрыхтоўвае глебу для далейшага выражэння думкі" [4, с. 182], напр.: *О **радзіма**, мой светач цудоўны, адзіны, / **Явар мой**, мой агністы снягір на сасне… (Ул. Караткевіч)*; ***Зямлячка**, шануй сваё семя, / На роднай зямлі караніся (Р. Барадулін)*.

Звароткі ствараюць у сказе эмацыянальную і экспрэсіўную атмасферу, выконваюць ацэначную функцыю, надаюць афарыстычнаму выслоўю самыя розныя адценні значэнняў, такія як памяркоўнасць, прыязнасць, фамільярнасць, іронія, радасць, напр.: *І трэба часам крыж пакуты / Панесці, **мілыя мае вы**… (Я. Колас)*, *Жывіце, **людзі добрыя**, буйней, / І цешцеся, і цешце без апаскі (Е. Лось)*, ***Людцы вы мае**, у кожным часе / Затоены свой нейкі план (Я. Колас)*, *О, **хітры свет**, на штукі здаўся! (Я. Колас)*, *О **радзіма**, мой светач цудоўны, адзіны, / Явар мой, мой агністы снягір на сасне… (У Караткевіч)*.

Звароткі ў афарызмах найчасцей выражаюцца назоўнікамі ў назоўным склоне (з паясняльнымі словамі ці без іх), напр.: *Жывіся ж вялікаю верай / У праўду, **мой брат**! (Я. Колас)*; у адзінкавых выпадках формай клічнага склону, напр.: *Гуслям, **княжа**, не пішуць законаў (Я. Купала)*.

У афарызмах ужываюцца наступныя структурныя тыпы звароткаў.

1. Неразвітыя звароткі, напр.: *Няўжо ж ты, **божачка**, пчале і мурашцы даў больш розум і лепшую душу, як чалавеку? (Я. Колас)*; ***Радзіма**, стой як горды ўцёс (Ул. Караткевіч)*.

2. Развітыя звароткі, напр.: *Ах, якая ты жорсткая ўсё-ткі, / **мудрасць людская** (Н. Гілевіч)*; *Мовай чужынскай і воляй варожай не пакарай мяне, **праведны Божа**! (А. Хатэнка)*.

Па спосабе ўжывання сустракаюцца:

1. Адзіночныя, так і напр.: *Не шукай сабе, **мой братку**, / З ветрам Бацькаўшчыну-матку (Я. Купала)*; ***Радзіма** ж, ты сёння і потым, / На заўтрае і на Святое! (В. Аколава)*.

2. Паўторныя звароткі, напр.: ***Каханне маё**, **каханне**, / Ты — як самазгаранне (А. Грачанікаў)*.

Афарыстычныя выслоўі, якія пабудаваны па мадэлі простага сказа ўскладненай будовы, складаюць амаль палову ад агульнай колькасці беларускіх літаратурных афарызмаў з сінтаксічнай структурай простага сказа.

Асноўнымі элементамі ўскладнення простага сказа ў афарыстычных выслоўях з'яўляюцца (паводле памяншэння прадуктыўнасці) аднародныя члены сказа (63,0%), параўнальныя канструкцыі (11,0%), адасабленні (10,0%), звароткі (8%), пабочныя (6,0%) і ўстаўныя канструкцыі (2,0%).

З дапамогай ускладнення сказа аўтар афарызма эксплікуе ўласную ацэнку паведамлення, стварае неабходны эмацыянальны фон, мадэліруе адпаведнае ўспрыняцце чытачом (слухачом) зместу выказвання.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Іваноў, Я. Я. Афарыстычныя адзінкі ў беларускай мове / Я. Я. Іваноў. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2017. – 208 с.
2. Бурак, Л. І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя / Л.І. Бурак. – Мінск : Універсітэцкае, 1987. – 320 с.
3. Шпакоўская, В. А. Сінтаксіс беларускіх літаратурных афарызмаў (просты сказ) / В. А. Шпакоўская // Веснік Мазырскага дзярж. пед. ун-та. – 2011. – № 1. – С. 111–116.
4. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка беларускай мовы / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 294 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова